N.

# Беларускі народны універсытэт у Маскве

Культурна-прасьветным аддзелам Беларускага Нацыянальнага Камісарыяту ў Маскве разсылаюцца па ўсім культурна-прасьветным і настаўніцкім арганізацыям просьбы апавесьціць аб адчыненьні на лета 1918 г. у Маскве беларускаго народнага універсітэта і прыслаць двех сваіх членаў на слуханне лекцыяў.

Летні сэместр працягваецца ад 1 ліпеня да 1 верасьня (2 месяцы).

Будуць чытацца лекцыі па пытанням: 1) Беларусазнаўства (мова і літаратура, гісторыя, этнаграфія і геаграфія, народная гаспадарка, нацыянальна-рэвалюцыйны рух і г. д.); 2) Соцыяльна-палітычным (государство і яго кшталты, гісторыя народнай гаспадаркі, аграрнае пытанне, рабочае пытанне, нацыянальнае пытанне, гісторыя рэвалюцыйнага руху на Заходзе і ў Расіі, гісторыя соцыялізму); 3) Агульна-пэдагогічны (гісторыя прасьветы на захадзе і ў Расіі, зашкольная прасьвета, дашкольнае выхаванне, працоўная школа і г. д.); 4) Прыродазнаўства (філязофія прыродазнаўства, засады астрономіі, геологіі, біялогіі і г. д.).

У студэнты прыймаюцца настаўнікі і настаўніцы нізшых і сярэдніх школаў на Беларусі, прэдстаўнікі ад прасьветных аддзелаў, радаў рабочых і сельскіх дэпутатаў на Беларусі, члены беларускіх культурна-прасьветных арганізацыяў і ўсе цякавячыяся беларускай народнасцю і культурай.

Вучэнне будзе ісьці штодзённа ў вечары, не меней 4 гадзін у дзень. Слуханне лекцыяў бясплатнае. Для прыездных настаўнікаў і настаўніц і дэлегатаў нацыянальных і культурна-нацыянальных арганізацыяў будзе дадзено дармовае памяшканне (на 100 асоб), а бяднейшым, маючым адпаведныя пасьвеччанні матэрыяльнае падтрыманне і вернуты кошты за праезд.

Запісывацца можна па пошце, па тэлеграфу і яўляючыся лічна на Поварскую 52 у культурна-прасьветны аддзел.

Вітаючы паўстанне такой інстытуцыі, мы аднак моцна сумлеваемся ў тым, ці знойдуцца адпаведныя лектары — у Маскве — для такой шырокай праграмы. Другое, нам здаецца, што Масква цяпер саўсім ні адпаведнае мейсцо для навукі. Наўрад большэвікі дадуць спакойна займацца тамака навукаю і зрабіўшы націск на нашых «нацыянальных комісараў» ні уціснуць туды сваёй раз'едаючай палітыкі.

*Беларускі Шлях. 1918. № 78.*